ВЕТЭРЫНАРЫЯ

УДК 619:616.995.1-085:615.37]:636.3

М. В. ЯКУБОЎСКІ, Л. А. ШУНЬКО

ВЫКАРЫСТАННЕ ІМУНАСТЫМУЛЯТАРАЎ ПРЫ НЕМАТАДОЗАХ АВЕЧАК

Назіранні апошніх гадоў паказалі, што ў некаторых выпадках пад уздзеяннем розных фактараў павышаецца функцыянальная актыўнасць імуннай сістэмы, у выніку чаго развіваецца так званы другасны імунадэфіцыт. Адной з прычын яго развіцця з'яўляецца інвазія тым ці іншым відам гельмінтаў. Супрасіўнае дзеянне гельмінтаў можа быць накіравана на ахоўныя рэакцыі, што дзейнічаюць супраць іх саміх. Гэта і з'яўляецца прычынай працяглага іх выжывання ў арганізме гаспадара [1, 5].

Акрамя таго што некаторыя высокаэфектыўныя антгельмінтыкі, такія, як фенбендазол, івамек, албендазол і інш., што ўжываюцца пры нематадозах, аказваюць імунадэпрэсіўнае ўздзеянне на арганізм, прадукты раскладання гельмінтаў у выніку іх гібелі пасля дэгельмінтызацыі могуць пранікаць у тканкі і тым самым яшчэ больш абвастраць імунадыфіцыт у арганізме жывёліны [7].

У сувязі з гэтым у апошнія гады павысілася цікавасць да выкарыстання розных прэпаратаў, якія валодаюць імунамадулюючым дзеяннем з мэтай карэляцыі імуннага статуса арганізма пры розным паталагічным стане арганізма, у тым ліку і пры гельмінтозах. Найбольшае распаўсюджанне атрымалі левамізол і прэпараты вілачкавай залозы.

Левамізол (дэкарыс) шырока ўжываецца ў медыцынскай і ветэрынарнай практыцы ў якасці антгельмінтыку. Акрамя антгельмінтных уласцівасцяў, ён валодае яшчэ і выразным імунастымулюючым дзеяннем як на клетачны, так і на гумаральны імунітэт. Пры гэтым найбольш моцна ўздзейнічае прэпарат на клеткі з паніжанай функцыяй [2, 4].

Значнай біялагічнай актыўнасцю валодае адзін з прэпаратаў вілачкавай залозы — тымалін. Гэта высокаачышчаны гарманальны прэпарат, які стымулюе працэсы рэгенерацыі і нармалізуе паказчыкі Т- і В-сістэм [3, 4]. Існуе шмат звестак пра ўплыў тымаліну на гемастаз, клетачны і гумаральны імунітэт, а таксама пра шырокае яго выкарыстанне ў медыцыне пры захворваннях рознай этыялогіі [3, 4, 6].

У аспекце выкладзенага вышэй мы правялі даследаванні па вывучэнні ўплыву імунастымулятараў тымаліну і левамізолу на арганізм авечак, інвазаваных лёгачнымі і страўнікава-кішачнымі нематодамі.

Матэрыялы і метады даследаванняў. Даследаванні праводзілі на спантанна інвазаваных жывёлінах ва ўмовах віварыя. У доследзе выкарыстоўвалі 35 аўцаматак раманаўскай пароды двух-, трохгадовага ўзросту, падзеленых на сем груп. Авечкі I—V груп былі прыродна інвазаваны мюлерыямі і страўнікава-кішачнымі странгілятамі, жывёліны VI і VII груп заставаліся інтактнымі на працягу ўсяго доследу.

Жывёлінам I групы падскурна ўводзілі 7,5%-ны левамізола гідрахларыд у дозе 4,5 мг/кг жывой масы (па АДР) аднаразова. Авечак II групы апрацоўвалі левамізолам у такой жа дозе сумесна з 10%-ным